**УДК 930 (476) (1921–1939)**

# ГАНДАЛЬ І ГАНДЛЕВЫЯ АДНОСІНЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 ГАДОЎ У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***Л.В. ЛАЎРЭНКА***
***(Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)***

*Разглядаюцца падыходы польскай гістарыяграфіі да вывучэння заходнебеларускага гандлю ў 20–30-я гг. ХХ ст. Праводзіцца аналіз і абагульняюцца найбольш значныя працы, прысвечаныя развіццю гандлю і гандлёвых адносін на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд яе ўваходжання ў склад Польшчы. У навуковы зварот уводзяцца новыя матэрыялы, якія з'явіліся ў выніку апрацоўкі асобных фондаў Універсітэцкай бібліятэкі ў Варшаве (Польшча), Архіва Новых Актаў (Варшава, Польшча), Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці. Адзначаецца гістарыяграфічная важнасць прац польскіх аўтараў.*

***Ключавыя словы**: гандль, гандлевыя адносіны, Заходняя Беларусь.*

**Уводзіны.** Гандаль – складаны прадмет даследавання. Ён з'яўляўся важнай крыніцай папаўнення дзяржаўнага бюджэту краіны і ўяўляў сабой своеасаблівы ўзровень дабрабыту насельніцтва ў пэўныя моманты часу, вымяраўся ўзровень спажывання людзей і ступень гаспадарчай актыўнасці. Рознічным гандалем вызначаліся стандарты спажывання, ствараліся новыя паслугі і тавары. Менавіта праз яго насельніцтва ўплывала на эканоміку і эканамічную палітыку дзяржавы. Праз свае запатрабаванні яно стымулявала развіццё ўсёй эканомікі, навукі і культуры.

Заходнебеларускі рынак меў шэраг спецыфічных рысаў. Ён характарызаваўся невялікай запатрабаванасцю ў спажывецкіх таварах у сувязі з нізкім дабрабытам насельніцтва і захаваннем значнага сектара натуральнай гаспадаркі ў вёсцы, невысокім узроўнем урбанізацыі і індустрыялізацыі, што выклікала недахоп фабрычных тавараў і неабходнасць у іх імпарце; наяўнасцю вялікай колькасці дробных паселішчаў і хутароў, што ўскладняла і забяспячэнне іх неабходнымі таварамі спажывання, і вынас на рынак сельскагаспадарчай прадукцыі з хутарскіх гаспадарак.

**Асноўная частка.** У польскай гістарыяграфіі вывучэнне даследуемай праблематыкі пачалося яшчэ ў 30-я гады ХХ стагоддзя. Звесткі аб сацыяльна-эканамічным развіцці заходнебеларускіх зямель змяшчаюцца ў працах У. Баранскага, Т. Нагурскага, Е. Панятоўскага, Е. Асмалоўскага, М. Марчака, Я. Карпінскага, С. Сымановіча [1–8]. Пытанні ўрбанізацыі, індустрыялізацыі, справы ў галіне камунікацыі, турызму і гандлёвых адносін на тэрыторыі Віленскага ваяводства разглядаюцца ў асобнай брашуры У. Баранскага «Прамысловыя і гандлёвыя праблемы Віленшчыны» [9]. Праца Ц. Галасіевіча «Навагрудская зямля. Неадкладныя эканамічныя і культурныя запатрабаванні» ўтрымлівае звесткі аб колькасці гандлёвых прадпрыемстваў на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства [10].

Немалое значэнне пры вывучэнні гісторыі гандлю і ў першую чаргу рознічнага гандлю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады маюць працы Я. Хадароўскага, М. Шышкоўскага, Я. Казлоўскага, Я. Мелеха, Р. Бержанака, І. Схіпера [11–16].

Асаблівую ўвагу заслугоўвае кніга Я. Хадароўскага «Структура ўнутранага таварнага гандлю ў Польшчы» [11], дзе аўтарам даецца класіфікацыя гандлёвых прадпрыемстваў адносна прадмету і віду гандлёвай дзейнасці, адносна галіны, а таксама арганізацыйнага тыпу і веравызнання ўласніка. Так, сярод прадпрыемстваў паводле прадмету дзейнасці, аўтар выдзеліў тры групы: прадпрыемствы гандлю таварамі, грашова-крэдытнага звароту і прадпрыемствы сферы паслуг. Да першый групы былі аднесены прадпрыемствы, прадмет дзейнасці якіх складала пастаўка спажыўцу пэўных тавараў. Тыповымі прадпрыемствамі дадзенага віду былі харчовыя магазіны, канфекцыёны (магазін ці аддзел, якія гандлявалі гатовымі сукенкамі і бялізнай), магазіны абутку, мэблі, электратэхнічных тавараў, парфумерныя магазіны. Да другой групы былі аднесены банкі, пазыковыя касы, крэдытныя кааператывы, абменныя канторы. Да трэцяй групы Я. Хадароўскі прылічыў прадпрыемствы, прадметам дзейнасці якіх з'яўлялася аказанне вызначаных паслуг. Да дадзенага віду адносіліся камунальныя, транспартныя прадпрыемствы, прадпрыемствы страхавання, пункты пракату (чытальні, пракаты фільмаў, лодак, вазоў), а таксама пляжы, офісы, інфармацыйныя і патэнтныя бюро, прадпрыемствы па найму, арэндзе памяшканняў, пахавальныя бюро [11, с. 2–12].

Адносна галін, прадпрыемствы былі падзелены на 38 груп. Па віду гандлёвай дзейнасці прадпрыемствы падзяляліся на аптовыя і рознічныя. Да аптовых адносіліся прадпрыемствы, якія здзяйснялі рэалізацыю тавараў вялікімі партыямі, галоўным чынам купцам і прамыслоўцам. Прадпрыемствы рознічнага гандлю – прадпрыемствы, якія прадавалі тавары выключна спажыўцам [11, с. 3, 7–8].

Аўтар таксама падае звесткі аб колькасці гандлёвых прадпрыемстваў як па ваяводствах, так і па асобных буйных гарадах, разглядае асноўныя галіны ўнутранага гандлю, характарызуе гандлёвыя прадпрыемствы па тыпу іх арганізацыі.

Галоўнай мэтай працы М. Шышкоўскага «Гандаль у разнос і вулічны гандаль» было высвятленне стасункаў, якія панавалі ў міжваеннай Польшчы ў галіне найбольш распаўсюджаных відаў гадлю, – вулічнага і разноснага, – апісанне іх форм і метадаў [12]. Аўтар у сваёй працы значнае месца адводзіць прававому стану пытання і апіраецца на асобныя распараджэнні Прэзідэнта Рэчы Паспалітай, Рады Міністраў, Міністэрства прамысловасці і гандлю, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства фінансаў, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і г.д. М. Шышкоўскі раскрывае сутнасць паняццяў «акруговы промысел», «гандаль у разнос», «вулічны гандаль», «вандроўны гандаль». Ён адзначае, што паняцце «гандаль у разнос» і «вулічны гандаль» супадаюць з паняццем «вандроўны гандаль», якое падзяляецца на гандаль у разнос і развозны гандаль – запазычаны з закона пра дзяржаўны прамысловы падатак, а таксама адпаведнага паняццю «акруговай прамысловасці», узятага з прамысловага права [12, с. 8–11, 18–26]. Пад вулічным гандлем у разуменні распараджэння Прэзідэнта II Рэчы Паспалітай ад 22 сакавіка 1928 г. «Аб часе гандлю і часе адкрыцці гандлёвых прадпрыемстваў і некаторых прамысловых» неабходна разумець продаж, што ажыцяўляўся на вуліцах і плошчах з «рухомых месцаў продажу» (кошыкі, маленькія столікі, скрыні і г.д.). Продаж газет і часопісаў, а таксама тытунёвых вырабаў у вулічных кіёсках, у якіх не прадаваліся ніякія іншыя тавары, таксама лічыўся вулічным продажам. У кнізе прысутнічаюць статыстычныя звесткі аб гандлярах па ваяводствах.

Работы Я. Казлоўскага і Я. Мелеха прысвечаны вядомаму на заходнебеларускіх землях Палескаму кірмашу. Я. Казлоўскі апісаў структуру і асноўныя этапы арганізацыі самага першага Палескага кірмашу, які праходзіў з 15 па 30 жніўня 1936 г. і з'яўляўся, на яго думку, «аглядам гаспадарчых сіл Палесся». Паходжанне Палескага кірмашу звязваецца з рэгіянальным мерапрыемствам «Свята Палесся» («Święto Polesia»), утвораным у 1935 г. ваяводскай турыстычнай камісіяй і Палескім ваяводскім упраўленнем. Аўтар адзначаў, што Палескі кірмаш – «першы светлы крок на дарозе да сацыяльна-эканамічнага адраджэння Палесся» [13, с. 4]. Праца насычана і вялікай колькасцю фотаматэрыялаў. Артыкул Я. Мелеха таксама змяшчае гісторыю стварэння Палескага кірмашу, характарыстыку асноўных аддзелаў Палескіх кірмашоў, адзначае іх вялікую эканамічную і культурную значнасць [14].

Р. Бержанак у сваёй публікацыі «Яўрэйскае насельніцтва на ўсходніх землях» разглядаў гісторыю яўрэйскага насельніцтва на ўсходніх ваяводствах Польскай дзяржавы, яго ўдзел у эканамічным жыцці краю, прыводзіў звесткі аб колькасці яўрэяў у гандлі і яўрэйскіх прадпрыемствах па ваяводствах, пералічваў асноўныя галіны эканомікі, у якіх яўрэі пераважалі, звяртаў увагу на дамінуючае значэнне яўрэяў у такіх галінах эканомікі, як прамысловасць, рамяство і гандаль [15].

І. Схіпер у працы «Гісторыя яўрэйскага гандлю на польскіх землях» даследаваў гандлёвыя адносіны яўрэйскага насельніцтва ў Польскай дзяржаве пачынаючы з XIII ст. да 1936 года. Калі гаварыць пра яўрэйскі гандаль у міжваенны перыяд, то тут неабходна звярнуць увагу на наступныя раздзелы: «Яўрэйскі гандаль у першае пяцігоддзе незалежнасці Польшчы (да 1923 г. уключна)», «Перамены ў гаспадарчай структуры яўрэяў і яўрэйскі гандаль у свеце перапісу насельніцтва ад 1921 г.», «Яўрэйскі гандаль у перыяд рэформы і стабілізацыі польскай валюты (1924–1928 гг.)», «Сітуацыя ў яўрэйскім гандлі ў перыяд крызісу (1929–1935 гг.)», «Праблемы ў яўрэйскім гандлі ў перыяд крызісу (1929–1935 гг.)» [16].

У працы І. Схіпера змяшчаюцца звесткі пра яўрэйскі гандаль як у цэлым па Польшчы, так і па асобных ваяводствах. Аўтарам ажыццёўлена перыядызацыя развіцця польскага гандлю ў залежнасці ад перыядаў эканамічнага развіцця краіны. Важнае месца І. Схіпер адводзіў аналізу заканадаўчай базы ў сферы гандлю і гандлёвых адносін, адзначыў негатыўны ўплыў інфляцыі, грашовай рэформы 1924 г., мытнай вайны 1925 г. з Германіяй, а таксама падатковай палітыкі дзяржавы на развіццё гандлю.

Польскія выданні міжваеннага часу мелі не навуковы, а пераважна ідэалагічна-прапагандысцкі характар, змяшчалі факталагічны матэрыял пра ўстанаўленне адміністрацыйнага апарату, прамысловае і сельскагаспадарчае развіццё, гандалёвыя адносіны. Працы польскіх аўтараў былі павярхоўнымі, аднак іх матэрыял не страціў сваёй значнасці і сёння.

На працягу некалькіх пасляваенных дзесяцігоддзяў польскія даследчыкі не займаліся праблемамі заходнебеларускага краю па прычыне абмежаванага доступу да архіўных крыніц, якія знаходзіліся ў большай сваёй частцы ў БССР. У гэты перыяд сярод прац, прысвечаных агульнапольскаму гандлю, неабходна адзначыць работу А. Хадолы і В. Ястжэмбоўскага, дзе разгледжаны гандлёвыя прадпрыемствы згодна прамысловых катэгорый, апісаны формы закупкі тавараў і гандлёвыя абароты, а таксама даследавана роля і месца сельскага гандлю, гандлёвы даход сялянскіх гаспадарак, арганізацыя і метады закупкі сельскагаспадарчых тавараў, рынкі збыту, накірункі развіцця рознічнага гандлю [17].

У кнізе «Сельскі гандаль у міжваеннай Польшчы. Лічбы і факты» А. Хадолы і В. Ястжэмбоўскі разглядалі гістарычнае развіццё гандлю ў Польшчы, зрабілі аналіз развіцця гандлёвых прадпрыемстваў у горадзе і на вёсцы, прывялі дадзеныя аб колькасці буйных гандлёвых прадпрыемстваў. Аўтары назвалі

дзве прычыны зніжэння развіцця гандлю ў краіне: памяншэнне колькасці насельніцтва (у выніку войнаў) і эканамічная палітыка польскіх улад, якая адлюстроўвалася ў падатковай палітыцы. Паводле падатковага заканадаўства прадпрыемствы і асобы, якія займаліся гандлем прафесійна, павінны былі выкупіць пасведчанні ад 1 да 5 катэгорыі, у залежнасці ад характару прадпрыемства і яго памераў. Менавіта дадзеныя пасведчанні з'яўляліся простым і дзейсным спосабам падаткаабкладання дробных магазінаў [17].

А. Хадолы і В. Ястжэмбоўскі ў сваёй працы выдзелілі гарадскі гандаль, які складаўся галоўным чынам з нешматлікіх, але буйных, рацыянальна арганізаваных прадпрыемстваў, а таксама гандаль з перыферыі гарадоў, мястэчак і вёсак – бедны, дрэнна арганізаваны, – які складаўся з вялікай колькасці аднаасобных устаноў, адзначылі, што рынкі, якія згодна з Прамысловым правам 1927 г. падзяляліся на вялікія і малыя, часцей за ўсё не мелі вагі рынка ў поўным разуменні дадзенага тэрміну, а таксама не мелі адпаведнай тэрыторыі. Аўтары зрабілі акцэнт на тым, што на вёсцы гандаль існаваў у форме скупкі. Здрабненне рынкаў з’яўлялася адлюстраваннем агульнай слабасці гандлю Заходняй Беларусі і Польшчы ў цэлым, адзначылі, што рынкі былі мясцовымі, дзе праходзілі як гандлёвыя транзакцыі сельскагаспадарчымі таварамі, так і жывёлагадоўчыя, а таксама рынкі вырабаў народнага промыслу [17].

У 1960–1980-я гады даследаваннем эканамічнай гісторыі Польшчы міжваеннага перыяду займаліся Я. Жарноўскі, Т. Грабоўскі, Е. Тамашэўскі, І. Кастравіцкая, З. Ландау [18–25]. У іх працах прасочваецца думка аб тым, што паўночна-ўсходнія ваяводствы (Заходняя Беларусь) былі аднымі з самых эканамічна адсталых ваяводстваў Польшчы, для якіх была характэрна слаба развітая гандлёва-прамысловая інфраструктура і нізкі ўзровень жыцця насельніцтва. Эканамічную адсталасць польскія даследчыкі тлумачылі незацікаўленасцю польскіх улад у прамысловым развіцці Заходняй Беларусі і ігнараванні праблем у развіцці аграрнага сектара.

У працы Я. Жарноўскага «Грамадства Другой Рэчы Паспалітай. 1918–1939 гг.», якая выйшла ў 1973 г., разглядаецца структура насельніцтва Польшчы праз яго прафесійную прыналежнасць. Аўтар здзейсніў сацыяльна-прафесійны падзел польскага насельніцтва згодна з перапісамі насельніцтва 1921 і 1931 гг. Так, у 1921 г. у галіне гандлю ў цэлым па Польшчы налічвалася 1700 тыс. чалавек, у 1931 г. – 1889 тыс., 1938 г. – 2117 тыс. [18, с. 21]. Аднак тыя дадзеныя, якія прыведзены ў кнізе, нельга лічыць за абсалютныя, бо, па-першае, у перапісе 1921 г. не ўлічаны звесткі па Віленскай зямлі і Верхняй Сілезіі; па-другое, колькасць прамысловых пасведчанняў, якія выкупаліся штогод для гандлёвых прадпрыемстваў былі адноснымі паказчыкамі, улічваючы тое, што гандлёвыя прадпрыемствы былі прадпрыемствамі «сямейнымі» і амаль ¾ насельніцтва ў галіне гандлю складалі асобыя гандляры [18, с. 19].

Згодна з дадзенымі, прыведзенымі Я. Жарноўскім, у Вільні ў 1921 г. у гандлі было занята 24 тыс. чалавек, у Віленскім павеце – 11 тыс. чалавек [18, с. 38]. На аснове на колькасных дадзеных аўтар робіць выснову, што ў Польшчы ў 1921 г. у гандлі было занята 3% насельніцтва, у 1931 і 1938 гг. – па 4% адпаведна. У працы Я. Жарноўскага таксама прыводзяцца звесткі аб нацыянальным складзе гандляроў. Так, у Беластоцкім, Палескім, Навагрудскім і Віленскім ваяводствах (не ўлічваючы Вільні) у гандлі было занята толькі 9 тыс. чалавек праваслаўнага веравызнання [18, с. 386]. У 1938 г. у Беластоцкім ваяводстве з 16,2 тыс. прадпрыемстваў 9,8 тыс. належала яўрэям, у Віленскім – 14,8 і 9 адпаведна, Навагрудскім – 10,8 і 7, Палескім – 11,3 і 7,7 [18, с. 251].

Агульнай працай, якая адлюстроўвала эканамічнае становішча міжваеннай Польшчы і Заходняй Беларусі адпаведна, з’уляецца кніга Т. Грабоўскага «Роля дзяржавы ў эканоміцы Польшчы (1918–1928 гг.)» [19]. Тут аўтар разглядаў эканамічны стан дзяржавы пасля Першай сусветнай вайны, вылучаў перадумовы, а таксама асноўныя формы і напрамкі эканамічнай дзейнасці дзяржавы, разглядаў інвестыцыйную палітыку дзяржавы ў 1936–1939 гг. Праўда гандаль як асобны прадмет даследавання ў кнізе Т. Грабоўскага не разглядаўся. Аднак дадзенае даследаванне неабходна пры вывучэні гісторыі гандлю, бо яно змяшчае звесткі аб асноўных напрамках эканамічнага развіцця дзяржавы, якія несумненна ўплывалі і на развіццё гандлю як састаўной часткі эканомікі.

У сваёй манаграфіі Е. Тамашэўскі [26] зрабіў спробу прааналізаваць гаспадарчае жыццё аднаго ваяводства Заходняй Беларусі – Палескага. Сам аўтар сваю працу разглядаў як даследаванне праблем эканамічнай адсталасці Палесся. Е. Тамашэўскі значнае месца ў кнізе адвёў вывучэнню нацыянальнай і сацыяльнай структуры насельніцтва і яго матэрыяльнай культуры. Так, паводле дадзеных, прыведзеных у кнізе, у 1934 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства пражывала 14,5% польскамоўнага насельніцтва, 6,7% – беларускамоўнага, 4,8% – украінскамоўнага, 62,4% насельніцтва, якое размаўляла на «тутэйшай» мове і 10% – на ідыш [26, с. 24]. У дадзеных раздзелах можна сустрэць асобныя звесткі адносна гандлю і гандлёвых адносін. Больш поўна гандлёвыя адносіны разглядаюцца ў рамках асобнага раздзелу, прысвечанаму тавáрнай гаспадарцы на вёсцы. Так, Е. Тамашэўскі адзначаў, што лішкі выраблена́й прадукцыі сяляне вывозілі на базары і кірмашы, дзе большасць тавараў куплялі пасрэднікі [26, с. 68]. Продаж у сельскіх мясцовасцях Заходняй Беларусі ажыццяўляўся за грошы, але шырока быў пашыраны і менавы гандаль, які быў распаўсюджаны пераважна на вёсцы.

Пачынаючы з 90-х гадоў XX стагоддзя ў польскай гістарыяграфіі назіраецца пашырэнне тэматычных накірункаў. Сацыяльна-эканамічнае развіццё асобных населеных пунктаў Заходняй Беларусі даследавалася А. Маркоўскім, З. Тамчонак, С. Савічам, Р. Ралецкім [27–30] і інш. Аўтары засяроджвалі сваю ўвагу на паўсядзённым жыцці заходнебеларускага насельніцтва, шырока выкарыстоўвалі матэрыялы вуснай гісторыі. Рэгіянальнаму развіццю Беластоцкага ваяводства прысвечана праца Я. Мілеўскага [31].

Сярод дадзеных прац асаблівую ўвагу заслугоўвае праца Р. Ралецкага «Чудзін. Сяло Лунінецкага павета. Сацыяльна-эканамічныя адносіны» [30]. Менавіта тут апісваецца менавая форма гандлю, якая ўпаміналася раней. Аўтар у сваёй працы адзначае, што асноўнымі прадуктамі абмену сялян былі малочныя прадукты, птушка, жыта і бульба. Мянялі іх галоўным чынам на прамысловыя тавары: абутак, скуру, адзежу, мануфактуру. "У в. Чудзін вельмі мала прадавалася малочных прадуктаў. Яйкі тут абменьваліся ў мясцовых магазінах на соль, фарбу для льняных сукенак, запалкі, газу і іншыя тавары. Ні масла, ні малако не прадавалі, бо самі адчувалі недахоп дадзенага віду тавараў. Кірмашы і базары, якія праводзіліся ў Клецку і Ганцавічах, на гаспадарчае жыццё в. Чудзін аказвалі малаважны ўплыў. Часцей за ўсё селянін ехаў туды з мэтай купіць трохі збожжа ці іншых тавараў і адвозіў туды трохі льнянога насення, сушаных грыбоў або некалькі штук авечых шкур" [30, с. 189].

У працы Г. Карыцкага «Купецкая этыка і прыватны гандаль у ІІ Рэчы Паспалітай» паказана спецыфіка і каларыт прыватнага гандлю, характэрнага для Польшчы 20–30-х гадоў XX ст. Аўтар раскрыў паняцце «ўнутранны гандаль» і вызначыў яго складнікі, апісаў падатковую палітыку дзяржавы ў сферы гандлю, разгледзеў асноўныя віды падаткаў і выплат. У працы прыведзены статыстычныя звесткі аб колькасці гандлёвых прадпрыемстваў у адпаведнасці з прамысловымі пасведчаннямі па ваяводствах. Асаблівую ўвагу аўтар надаў даследаванню яўрэйскага пытання ў гандлі і палітыцы дзяржавы па яго рэгуляванні. Адметнасцю працы Г. Карыцкага з'яўляецца таксама грунтоўнае вывучэнне праблемы развіцця прыватнага гандлю на тэрыторыі Польшчы ў міжваенны перыяд: крымінальная адказнасць за нядобрасумленнае абслугоўванне пакупнікоў, няякасны тавар і інш., пералік тавараў, імпартуемых на тэрыторыю Польшчы, купецкая этыка, рэклама ў гандлі і г.д. У кнізе аўтарам таксама узняты праблемы і цяжкасці, з якімі сутыкаліся польскія купцы, разгледжана сістэма крэдытавання і фунцыянавання асноўных гандлёвых прадпрыемстваў [32].

Удзел яўрэяў у эканамічным жыцці Польшчы разглядаўся ў работах гісторыкаў Е. Тамашэўскага, Э. Мендэльсона, А. Клугмана, Р. Дамброўскага, А. Грабона [33–37], публікацыях Б. Чарнецкага, Я. Жындула, В. Вяжбінца [38–41]. Эканамічным узаемаадносінам палякаў і яўрэяў прысвечаны таксама працы М. Хадакевіча, Я. Валканоўскага, Б. Ганцарскай-Кадары [42–44].

Так, З. Ландау і Е. Тамашэўскім выданы шэраг прац, прысвечаных сацыяльна-эканамічнай гісторыі міжваеннай Польшчы, у якіх на аснове вялікай крыніцазнаўчай базе разгледжаны нацыянальны склад насельніцтва, палітыка дзяржавы ў галіне сельскай гаспадаркі, прамысловасці, рамяства і гандлю. Выдзелены асноўныя этапы эканамічнага развіцця Польшчы.

Кароткі агляд Палескіх кірмашоў робіць у сваім артыкуле П. Ціхарацкі [45]. Больш поўна Палескія кірмашы польскімі аўтарамі разглядаліся ў кнізе «Палескія кірмашы – спроба актывізацыі эканамічнага жыцця» [46], якая з'яўляецца 4-м томам серыі «Дакументы па гісторыі паўночна-ўсходніх крэсаў ІІ Рэчы Паспалітай», заснаванай у 2004 г. У дадзеным томе змяшчаюцца дакументы па арганізацыі ўсіх чатырох Палескіх кірмашоў 1936–1939 гг., а менавіта: склад арганізацыйнага камітэту, пратаколы з пасяджэнняў дадзенага камітэту, уставы, каштарысы, справаздачы, праграмы, афішы і г.д. Паказана роля кірмашоў у эканамічным развіцці Палескага ваяводства.

**Заключэнне.** У цэлым гістарыяграфія даследуемай праблемы складаецца з дастаткова шырокай даследчай базай, якая вядзе свой пачатак з 1930-х гг. У польскай гістарыяграфіі гандаль і гандлевыя адносіны на тэрыторыі Польшчы міжваеннага перыяду разглядаліся менавіта ў кантэксце эканамічнай гісторыі Польшчы. Асноўная ўвага ў польскай гістарычнай навуцы адводзілася эканамічнай адсталасці паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Спецыяльных даследаванняў, прысвечаных гісторыі гандлю ў краіне ў міжваенны перыяд вельмі мала і разглядалі яны пераважна вызначаныя пытанні. Асобных прац, прысвечаных праблеме гандлю і гандлёвых адносін на заходнебеларускіх у 20–30-я гг. XX ст., увогуле няма. Інфармацыя аб ім падаецца ў агульных сюжэтах з агульнапольскім гандлем. Аднак адметнасцю некаторых гэтых прац з'яўляецца тое, што некаторыя польскія аўтары выкарыстоўвалі ў сваіх працах вусную гісторыю і акцэнтавалі ўвагу на вывучэнні паўсядзённага жыцця насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. Barański, W. Akcja gospodarcza na ziemiach północno-wschodnich / W. Barański. – Wilno, 1934. – 30 s.
2. Nagurski, T Gospodarka finansowa miasta Wilna / T. Nagurski. – Wilno, 1929. – 93 s.
3. Nagurski, T. Przemysł i handel w Wileńskiem i Nowogródzkiem / T. Nagurski. – Wilno, 1934. – 64 s.
4. Poniatowski, J. Polesie u gospodarczej structurze Polski / J. Poniatowski. – Wilno : Znicz, 1934. – 16 s.

5. Osmalowski J. Stan gospodarczy i działalność samorządu powiatowego województwa Poleskiego / J. Osmalowski. – Warszawa, 1926. – 30 s.
6. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marzak. – Brześć, 1935. – 156 c.
7. Karpiński, J. Krótki przewodnik po puszczy Białowieskiej / J. Karpiński, M. Orłowicz. – Białystok : Wydaw. Związku Popierania Turystuki Woj. Białostockiego, 1937. – 56 c.
8. Symonowicz, S. Zadłużenie rolnictwa województw Wileńskiego i Nowogródzkiego / S. Symonowicz. – Wilno, 1934.
9. Barański, W. Problemy przemysłowe i handlowe Wileńszczyzny (Referat wagłoszony na Zjeździe Działaczy Gosp. i Społ. Wojew. Wileńskiego w dniu 8. IX. 1933 r.) / W. Barański. – Wilno, 1933. – 17 s.
10. Galasiewicz, C. Ziemia Nowogródzka. Najpilniejsze gospodarcze i kulturalne potrzeby. – Nowogródek, 1936. – 73 s.
11. Chodorowski, J. Struktura wewnętrznego handlu towarowego w Polsce / J. Chodorowski. – Warszawa : Nakładem Izby Przemysłowo-Handlowej w Warszawie, 1938. – 151 s.
12. Szyszkowski, M. Handel domokrążny i uliczny / M. Szyszkowski. – Warszawa, 1937. – 43 s.
13. Kozłowski, J. Pierwszy «Jarmark Poleski» w Polsce odrodzonej / J. Kozłowski. – Brześć nad Bugiem, 1937. – 48 s.
14. Melech, E. Skąd się wziął Jarmark Poleski? / E. Melech // Dni Polesia. – 1939. – S. 4–8.
15. Bierzanek, R. Ludność żydowska na Ziemiach Wschodnich / R. Bierzanek // Rocznik Ziem Wschodnich. – 1939. – S. 63–72.
16. Schiper, J. Dzieje handlu żydowskiego na ziemiach Polskich / J. Schiper. – Warszawa, 1937. – 792 s.
17. Hodoly, A. Handel wiejski w Polsce międzywojennej. Liczby i fakty / A. Hodoly, W. Jastrzębowski. – Warszawa : Polskie Wydawnictwa gospodarcze, 1957. – 263 s.
18. Żarnowski J. Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918–1939 / J. Żarnowski. – Warszawa : Państwowe wydawnictwo naukowe, 1973. – 436 s.
19. Grabowski T. Rola państwa w gospodarce Polski. 1918–1928 / T. Grabowski. – Warszawa : Państwowe wydawnictwo ekonomiczne, 1967. – 303 s.
20. Landau, Z. Gospodarka Polski międzywojennej 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1967–1989. – T. I : W dobie inflacji. 1918–1923. – 1967. – 399 s.
21. Landau, Z. Gospodarka Polski międzywojennej 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1971. – 359 s. – T. П : Od Grabskiego do Pilsudskiego. Okres kryzysu koniunktury. – 1924–1929.
22. Landau, Z. Gospodarka Polski międzywojennej 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1989. – T. III : Wielki kryzys (1930–1935). – 450 s.
23. Landau, Z. Trudna niepodległość. Rozważania o gospodarce Polski 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1968. – 160 s.
24. Landau, Z. Zarys historii gospodarczej Polski. 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa, 1986. – 352 s.
25. Kostrowicka, J. Historja gospodarcza Polski XIX–XX wieku / J. Kostrowicka, J. Tomaszewski, Z. Landau. – Wyd. 2 zmienione. – Warszawa, 1975. – 589 s.
26. Tomaszewski, J. Z dziejow Polesia 1921–1939. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. − Warszawa, 1963. – 209 s.
27. Markowski, A. Z dziejów Wasilkowa w dwudziestoleciu międzywojennym / A. Markowski // Małe Miasta: historia i współczesność : praca zbiorowa pod red. M. Zemło, P. Czyżewskiego. – Supraśl : Współczesna Oficyna Supraska, 2001. – S. 113 –120.
28. Tomczonek, Z. Małe miasta Kresów Północno-Wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek // Małe Miasta: historia i współczesność : praca zbiorowa pod red. M. Zemło, P. Czyżewskiego. – Supraśl : Współczesna Oficyna Supraska, 2001. – S. 105–113.
29. Sawicz, C. Wileńszczyzna / C. Sawicz. – Halinów : QLCO, 2006. – 443 s.
30. Rolecki, R. Czudin. Wieś powiatu łuninieckiego. Stosunki społeczno-gospodarcze / R. Rolecki // Białoruskie zeszyty historyczne. – 26. – 2006. – S. 146–217.
31. Milewski, J. Z dziejów województwa Białostockiego w okresie międzywojennym / J. Milewski. – Białystok, 1999. – 137 s.
32. Korycki, G. Etyka kupiecka i handel przywatny w Drugiej Rzeczypospolitej / G. Korycki. – Warszawa, 1993. – 131 s.
33. Tomaszewski, J. Zarys dziejów żydów w Polsce w latach 1918–1939 / J. Tomaszewski – Warszawa : Wyd-wo Uniwersytety Warszawskiego, 1990. – 319 s.
34. Mendelson, E. Żydzi Europy Środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym / E. Mendelson . – Warszawa : Wyd-wo Naukowe PWN, 1995. – 356 s.
35. Klugman, A. Żyd – co to znaczy? / A. Klugman. – Warszawa : Państwowe Wyd-wo Wiedza Powszechna, 2003. – 223 s.
36. Dąbrowski, R. Działalność społeczno-gospodarcza i kulturalna mniejszości narodowych w Drugiej Rszeczypospolitej (1918–1939) / R. Dąbrowski. – Szczecin : Wyd-wo Naukowe US, 1990. – 238 s.
37. Grabon, A. Problematyka Żydowska na lamach prasy akademickiej w okresie międzywojnnym /A. Grabon. – Kraków, 2008. – 393 s.
38. Czarnecki, B. Rola historycznego rynku miejskiego we współczesnym funkcjonowaniu i strukturze małych miast Białostocczyzny / B. Czarnecki // Małe Miasta: historia i współczesność : praca zbiorowa pod red. M. Zemło, P. Czyżewskiego. – Supraśl : Współczesna Oficyna Supraska, 2001. – S. 79–95.
39. Żyndul, J. Społeczenstwo żydowskie Wilna i Wileńszczyzny w II Rzeczypospolitej / J. Żyndul // Kresy północno-wschodnie Drugiej Rzeczypospolitej (stan badań). – Białystok, 1993. – S. 53–76.
40. Wierzbiniec, W. Organizacja ziemiaństwa żydowskiego w II Rzeczypospolitej / W. Wierzbiniec. // Przegląd Historyczno Archiwalny. – 2002. – T. 11. – S. 233–245.
41. Wiezbieniec, W. Społeczność żydowska a polacy i ukraińcy w przemyślu w okresie II Rzeczypospolitej / W. Wiezbieniec. // Żydzi i judaizm we współczesnych badaniach polskich : materiały z konferencji, Kraków, 21–23. 11. 1995. – Kraków : Wydawnictwo Naukowe, 1997. – S. 281–292.

42. Chodakewicz, M. Żydzi i polacy 1918–1955 (współistnenie-zagłąda-komunizm) / M. Chodakiewicz. – Warszawa : APOSTOLICUM, 2000. – 721 s.
43. Wołkonowski, J. Stosunki polsko-żydowskie w Wilnie i Wileńszczyne 1919–1939. / J. Wołkonowski. – Białystok : Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2004. – 449 s.
44. Garncarska-Kadary, B. Żydowska ludność pracująca w Polsce. 1918—1939 / B. Gancarska-Kadary. – Warszawa : Żydowski Instytut Historyczny IN-B, 2001.– 293 s.
45. Тихорацкий, П. Воспоминания о «Полесских ярмарках» / П. Тихорацкий // Гістарычная Брама. Гісторыя і культура Палесся. – 2009. – №1(24). – С. 51–53.
46. Jarmarki Poleskie – próba aktywizacji życia gospodarczego / oprac. naukowe W. Śleszyński, A. Włodarczyk. – Kraków : Wyd-wo AVALON, 2013. – 147 s.

*Пастyпiў 11.04.2016*

## TRADE AND TRADE RELATIONS OF WEST BELARUS IN 1921–1939 IN POLISH HISTORIOGRAPHY

***L. LAVREENKO***

*Different approaches of Polish historiography are considered to studying West Belarussian trade in the twenties-thirties of the 20th century. An analysis was carried out and the most significant works on the development of trade and trade relations in the territory of West Belarus during its entering into Poland were generalized. A feature of this work is using new materials that have appeared as a result of the processing of individual funds of Warsaw University Library (Poland), an archive of New Octave (Warsaw, Poland), State Archives of Brest Region, State Archives of Grodno Region. The author points out the importance of the historiographical works of Polish authors.*

***Keywords****: trade, trade relations, West Belarus.*